*Я. Я. Казанцаў*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*Y. Y. Kazantseu*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 346.21**

# ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ ДЗЕЙНАСЦІ МЛЫНАРОЎ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ XVI–XVIII СТСТ.

# LEGAL ASPECTS OF MILLERS' ACTIVITIES IN THE XVI–XVIII C. GRAND DUCHY OF LITHUANIA

*У артыкуле разглядаюцца праблемы прававога статуса млынароў у заканадаўстве і некаторыя выпадкі ўдзелу млынароў у прававым працэсе Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Гэтыя выпадкі звязаныя з нерухомай маёмасцю, арэнднымі адносінамі, фінансавымі пытаннямі і адказнасцю бакоў.*

*Ключевые слова: Статуты Вялікага Княства Літоўскага; Устава на валокі; заканадаўства; млынарства; млынары; арэнда.*

*The article deals with issues of legal status of millers in the legislation and several cases of millers' participation in the legal process of the XVI–XVIII c. Grand Duchy of Lithuania. These cases are dealing with real estate, leasing, financial issues, and responsibility of the parties.*

*Keywords: Statutes of Lithuania; Volok Reform law; legislation; milling; millers; lease.*

У Навейшым часе навукова-тэхнічная рэвалюцыя прывяла да развіцця інфармацыйных тэхналогій і пераўтварэння іх у адмысловую галіну эканомікі. Гэта выклікала неабходнасць рэгулявання іх дзейнасці прававымі актамі. Падобным чынам і на мяжы Сярэдніх вякоў і Новага часу развіццё прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага не магло не закрануць такой тэхналагічнай дзейнасці, як млынарства.

Артыкул 11 Раздзела 8 Статута ВКЛ 1529 г. «Естли бы хто своим ставом инший став або сеножати затопил» [5, с. 456–457] вызначае парадак кампенсацыі шкоды, нанесенай у выніку насыпання грэблі. Гэта мусіў рабіць віноўнік затаплення, у прысутнасці віжа спусціўшы ваду. Выключэннем з'яўляўся выпадак, калі гаспадар млына затапляў чужую сенажаць са згоды яе гаспадара. У такім разе гаспадару млына забаранялася затапляць чужыя млыны, размешчаныя вышэй па рацэ. Без дазволу таксама забаранялася насыпаць грэблю да чужога берага. Артыкул 12 Раздзела 9 Статута ВКЛ 1566 г. «Коли бы хто своим ставом иншый став або сеножати затопил» змяняе віжа на вознага [5, с. 522]. Яшчэ больш ускладняе працэдуру Артыкул 21 Раздзела 9 Статута ВКЛ 1588 г «Коли бы хто своим ставомъ инший ставь або сеножати затопил або греблю к чужому берегу присыпал». Возны быў павінен у парадку дасудовага ўрэгулявання папярэдзіць віноўніка «листом упоминальным». Калі той не спускаў ваду і не кампенсаваў шкоду,

справа накіроўвалася па інстанцыях у земскі суд, а затым у суд падкаморага, які прадпісваў адказніку выплаціць штраф (кгвалт) памерам у 12 рублёў (1200) грошаў. Акрамя таго, вызначалася даўнасць справы ў 10 гадоў, пасля чаго яна не магла разглядацца ў судзе [5, с. 647–648].

Артыкул 7 «Хто бы кому озеро або сажовку, або став зволочил» Раздзела 9 Статута ВКЛ 1529 г. прымушаў віноўніка не толькі кампенсаваць шкоду і адбудаваць млын, але і сплаціць штраф у памеры 12 рублёў грошаў гаспадару пашкоджанай маёмасці і столькі ж каралю [5, с. 459]. Артыкул 7 Раздзела 10 Статута ВКЛ 1566 г. «Хто бы кому озеро або став або сажовку зволочил або млын изжог» мае мякчэйшую санкцыю, бо штраф спаганяецца толькі ў адрас пацярпелага боку [5, с. 525]. Артыкул 7 Раздзела 10 Статута ВКЛ 1588 г. «Хто бы кому озеро албо ставъ, або сажовъку зволочилъ, або млынъ зжогъ» дадае яшчэ адзін штраф («заплату пенежную») у выпадку адмовы віноўніка адбудоўваць млын [6, с. 652].

Акрамя таго, млыны фігуруюць у Артыкуле 7 Раздзела 5 Статута ВКЛ 1529 г. у якасці крыніцы прыбытку апекуноў, які мусіць выкарыстоўвацца для выхавання і матэрыяльнага забеспячэння дзяцей [6, с. 446]. Такая ж норма прысутнічае ў Артыкуле 4 Раздзела 6 Статута ВКЛ 1566 г [6, с. 514].

Артыкул 21 раздзела 9 Статута ВКЛ 1588 г. абвяшчаў: «А такового ставу, где хто оба берега свои маючы, воду ку шкоде млива суседнего подвышилъ або чужого кгрунту залиль або подъмочылъ, воду спустити и знижыти такъ, яко бы и мливу верхнего ставу ничого не шкодило, и кгрунтов, сеножатей чужыхъ не заливало и шкодливе не подъмочывало. А тую греблю, которая бы присыпана к чужому берегу, жебы раскопалъ и воду выпустилъ такъ, яко бы чужого кгрунту греблею не дотыкалъся и водою его не заливалъ» [1, с. 447–448].

Беларускі даследчык Юрый Внуковіч прыводзіць наступны выпадак з практыкі прымянення згаданага артыкула 21 раздзела 9 Статута ВКЛ 1588 г. [4, с. 461–462] У пачатку XVII ст. падкаморскі суд Берасцейскага ваяводства разглядаў скаргу зямян Калячыцкіх на зямяніна Кендзяраўскага таго ж ваяводства. Калячыцкія патрабавалі зносу млыноў і грэблі, а пан Кендзяраўскі, у сваю чаргу, даводзіў, што ён будаваў грэблю выключна на сваіх землях. Падкаморы Васіль Копаць за даўнасцю здарэння слядоў падтаплення на месцы не знайшоў, аднак для недапушчэння ўладальніку млына прадпісвалася падтрымліваць бяспечны ўзровень вады ў вадаёме (за выключэннем вясенніх і асенніх паводак), для чаго перад вадаспускам былі ўбіты дзве сваі, маркіраваныя выпаленымі меткамі герба падкаморага. Канчатковае ж рашэнне падкаморскага суда па гэтай спрэчнай справе было наступным: «тотъ млынъ на реце Нурцу, названный Лучка, о который споръ ишолъ, сполне они все три участники звышменованые држати маютъ по тыждню. А если бы се трафило которому зъ нихъ въ чужомъ тыждни на дворную потребу молоти, теды жита по две бочки, а солоду также безъ мерки змолоти

вольно и не маютъ того собе боронити. А млынара маютъ мети спольного, давши ему оселость спольную кождый зъ своее части и тотъ млынъ маютъ вшелякими потребами спольне опатровати, яко железомъ, каменьми и деревомъ. А особливе греблю такъ маютъ, якобы вода завше на кола водные для ихъ пожитку, хотябы и далей што кгрунтовъ, сеножатей, гаевъ лесовъ залила поднесеньемъ гребли, о то вже зъ обохъ сторонъ вечне молчати маютъ, я ко спольные участники» [2, с. 301].

Дзейнасць млынароў у Статутах амаль не згадваецца. Тым не менш, Артыкул 8 7-га Раздзела Статута ВКЛ 1588 г. дае права людзям простым вольным пахожым арандаваць млыны, абавязваючы весці дакументацыю [5, с. 634], а Артыкул 11 Раздзела 13 далучае млынарскія прылады працы да начыння рамеснікаў [5, с. 680]. Значна лепш прававы статус млынароў акрэслены ў артыкуле 27 Уставы на валокі 1557 г. Ён тычыцца працаўнікоў вадзяных мучных млыноў, фолюшаў і млыноў на руду. Млынарам давалася валока зямлі, траціна збожжа (мерка) і права кіраваць працамі на млыне і сажалцы. Дзве траціны мусілі ісці ў гаспадарскі скарб (відаць, маюцца на ўвазе велікакняжацкія землі). Млынар мусіў з дапамогай падданых ахоўваць млын і за ўласны кошт набываць дэталі. Акрамя таго, за валоку зямлі ён быў павінен два дні ў тыдзень адпрацоўваць павіннасць цяслярскай працай. Млынар, які ўчыніў злачынства, губляў права займацца гэтай прафесіяй. У выпадку незразумелых абставін справы, звязаных з прафесійнай дзейнасцю, суд мог выклікаць іншых млынароў для дачы паказанняў [3, с. 78–79].

Дзеля параўнання, у сярэдневяковай Англіі вольныя людзі арандавалі млыны ў феадала і малолі збожжа па кошце 1/20. Пры гэтым млынар, які ўчыніў шкоду, мусіў кампенсаваць яе ў судзе паводле непісанага манарыяльнага права [13, p. 189]. Пазней адмысловыя законы «Assisa Panis» (мера хлеба) і «Judicium Pillorie» (вырак – ганебны слуп) забаранялі падробку мерных прыбораў. Пакаранні ўключалі канфіскацыю маёмасці, ганебны слуп, ганебныя сані [13, p. 188–201]. Арэндныя адносіны, згаданыя ў рэвізіі 1086 г., вядомай як «Кніга Страшнага суда», выражаюцца тэрмінам сокідж – арэнда зямлі без абавязковага нясення ваеннай службы. Рэшткі сокі, права феадалаў на юрысдыкцыю або штрафаванне і канфіскацыю на пэўнай тэрыторыі, брытанскія даследчыкі гісторыі млынарства Рычард Бенет і Джон Элтан назіралі яшчэ ў XIX ст. [13, p. 202–282].

Вяртаючыся да Вялікага Княства Літоўскага, варта заўважыць, што вытворчасць млына найперш залежала ад асобы млынара, які адказваў за памол збожжа і тэхнічны стан млына, става і грэблі. У выпадку паводкі ён мусіў своечасова паведамляць арандатару або ўласніку пра пагрозу і самому прадухіляць наступствы. У адваротным выпадку ён падлягаў строгай адказнасці.

Млынарам «для браня песку на греблю» давалася да некалькіх гектараў «кгрунту подлого», «преподлого» ці «ничемного», вызваленага ад падаткаў

(«от платов волнихъ»). Падтрымка грэблі ў належным стане з’яўлялася абавязковай павіннасцю прыгонных сялян, што зафіксавана ў шматлікіх інвентарах і распараджэннях землеўладальнікаў XVI–XVIII стст. У час паводак пры пагрозе прарыву грэблі сяляне мусілі тэрмінова бегчы ратаваць млын («на гвалт з дыму як да гашэння агню бегчы» [1, с. 127]).

У першай палове XVI ст. існавалі адмысловыя спецыялісты – пруднікі, якія павінны былі даглядаць за ставамі, грэблямі і млынамі. У 1549 г. у г. Радашковічах жыў пруднік Касцюк Андрэевіч. Ён меў дом у горадзе, выраблеў мёд, піва і трымаў карчму, дзе іх рэалізоўваў. Звычайна карчмары мусілі плаціць капшчызну – грашовы падатак за выраб і рэалізацыю алкагольных напояў. Але выпадак Касцюка Андрэевіча быў іншым. Ён быў «человекъ потребный», бо валодаў здольнасцю да інжынернай справы. І таму ён выконваў павіннасць, якая заключалася ў рамонце і падтрыманні ў належным стане вадзяных млыноў. Пры гэтым рэвізор адзначыў, што такая павіннасць выконвалася «водлугъ давного обычаю» [6, с. 94]. Гэта значыць, Касцюк Андрэевіч мог быць не першым пруднікам у Радашковічах, які выконваў такую працу. Млыноў у горадзе паводле вопісу 1549 г. налічвалася тры: два на ставе на рацэ Вязыні каля замку і Новага места з адным колам кожны і адзін на ставе на рэках Гуй і Вязынь таксама з адным колам. Усе яны цярпелі ад паводак і патрабавалі догляду спецыяліста. Акрамя таго, першыя два млыны пэўны час перад вопісам мелі па два колы, а трэці таксама меў тэхнічную магчымасць дадатковага кола [9, арк. 174–174а]. Гэта паказвае, што пруднік увесь час мог знайсці, чым займацца на млынах.

Паводле звестак беларускага даследчыка В. І. Мялешкі, млынары самі ажыццяўлялі бягучы рамонт абсталявання, набываючы новае пры неабходнасці. З сялян, якія прывозілі зерне на памол, млынар спаганяў гарнцавы збор (мерку), памер якога ўсталёўваў землеўладальнік. За працу на млыне млынару належыла 1/3 гарнцавага збору. Аднак на практыцы з гэтай сумы млынар мусіў плаціць штогадовы падатак феадалу, які называўся «колавае». У некаторых маёнтках да сярэдзіны XVII ст. млынары мелі павіннасць карміць панскіх свіней, але з другой паловы XVII ст. гэты абавязак сталі замяняць грашовым эквівалентам – «вяпроўшчынай» [7, с. 121]. Тым не менш, дзе-нідзе ён захаваўся да канца XVIII ст. Напрыклад, у маёнтку Геаргінава Мсціслаўскага ваяводства паводле інвентара 1787 г. млынары з вёскі Навапруддзе павінны былі аддаваць у скарб землеўладальніка штогод па дзве добра адкормленыя свінні. Паколькі на той час гэты маёнтак знаходзіўся ў складзе Расійскай імперыі, з прыгонных млынароў таксама спаганяўся падушны падатак у манаршую казну [15, l. 12].

Сярод іншых расходаў млынароў з дамовы на арэнду млыноў і корчмаў у Копыскім графстве 1776 г. вядомы абавязак млынара несці 1/3 расходаў на набыццё жалеза і млынарскіх камянёў, неабходных для рамонта млына [12, s. 7].

Дадатковай крыніцай прыбытку млынара, акрамя долі з памола, маглі быць зямельныя валоданні ў памеры да адной «вольнай» валокі, за карыстанне якой млынар не нёс ніякіх павіннасцей. А ў тым выпадку, калі млынар меў уласны зямельны надзел, ён вызваляўся як ад паншчыны, так і ад натуральных павіннасцей і мусіў выплочваць толькі грашовы чынш [14, s. 163, 267]. На думку В. І. Мялешкі, феадалы рабілі гэта з мэтай прывязаць спецыяліста да прадпрыемства і матэрыяльна зацікавіць, бо памер і структура даходаў млына шмат у чым залежалі ад дзейнасці і кваліфікацыі млынара [7, с. 122].

Акрамя землеўласніка-феадала, млынар таксама меў пэўныя абавязкі перад сваім арандатарам. Млынар мусіў ва ўсім падпарадкоўвацца арандатару, выконваючы ўсе ягоныя даручэнні. Вышэй згаданы гарнцавы збор толькі на 1/3 належаў млынару, а рэшту (2/3) даводзілася здаваць адкупшчыку. У выпадку невыканання абавязкаў або няздольнасці да працы на млыне арандатар атрымліваў права адхіліць аднаго млынара і замяніць іншым. Аднак дзеля гэтага арандатар мусіў належным чынам патлумачыць неабходнасць такой замены землеўласніку [12].

Як адзначае В. І. Мялешка [7, с. 123], у якасці спецыялістаў на мукамольных прадпрыемствах працавалі прыгонныя сяляне землеўласніка, «лёзныя» людзі, мяшчане, а таксама людзі з іншых валоданняў і нават іншаземцы [14, s. 163]. Найбольш частымі з’яўляюцца першыя. Гэта былі сяляне-слугі, якія працавалі на млыне не толькі за зямельны надзел, як на іншых прадпрыемствах, але таксама карысталіся перавагамі млынароў (вызваленне ад працоўных і натуральных павіннасцей, карыстанне «вольнай» зямлёй, 1/3 гарнцавага збору) як спецыялістаў асабліва даходнага прадпрыемства. Іншыя рамеснікі-слугі (кавалі, бондары, ганчары, цесляры) мелі магчымасць староннягa заробку і продажу прадукцыі на рынку ці кірмашу, у той час як млынар мог працаваць на іншага феадала толькі ўзімку, калі вялося будаўніцтва млыноў.

Млынары як катэгорыя насельніцтва часам фігуруюць у інвентарах. Так, у інвентары маёнтка Стрэшын 1787 г. [16], які належаў Віленскай капітуле, пералічваюцца і называюцца па імёнах млынары вёскі Саланое, іх сямейнікі мужчынскага і жаночага полу, а таксама памеры падаткаў з кожнай гаспадаркі. Імёны млынароў – Міхал Пёрун, Павел Купёнак, Барыс Шыдлоўскі, Сямён, Ануфрый і Міхал Чадзяёнкі. Адзначаецца, што гэтыя сяляне мелі «вольныя» землі («na wolności siedzą») і не плацілі з гэтых земляў іншых падаткаў акрамя сталовага. У прыватнасці, кожная гаспадарка плаціла чынш у памеры 30 злотых і грашовае ў памеры 1 злотых і 20 грошa. Сума арэнды складала 150 злотых, колавага – 5 злотых [16, l. 21v–22].

Як адзначае В. І. Мялешка [7, с. 123–124], сярод млынароў не было роўнасці паводле маёмасці. Адны карысталіся зямельнымі надзеламі на ільготных умовах, маючы «вольныя» валокі і буйную рагатую жывёлу

для працы і прадукцыі. Напрыклад млынар у сяле Ганнаўка Крычаўскага староства ў 1747 г. валодаў зямельным надзелам, чатырма коньмі, пяццю каровамі, плаціў землеўласніку чынш у памеры 18 злотых 22 грошаў [9, арк. 81]. Іван Юркоў, млынар сяла Беразіно ў Любавічскім графстве ў 1765 г. меў палову валокі (чвэрць валокі аседлай і чвэрць валокі прыёмнай) і тры коні. У сям'і, акрамя яго, было яшчэ два працаўнікі. Памер штогадовага чыншу складаў 16 злотых і 22 грошаў. Млынар з таго ж сяла Іван Аршынаў карыстаўся паловай валокі, за якую плаціў 10 злотых і 11 грошаў чыншу. Ён меў трох коней, а ў сям'і было чатыры працаўнікі [18, l. 17]. Млынар Анох з вёскі Запрудаўка меў сына Мікалая, аднаго каня, чвэрць і асьміну валокі, а плаціў 18 тынфаў [17, l. 21v–22]. У інвентары мястэчка Крывічы [11, арк. 24] 1639 г. згадваецца млынар Мікалай Станіслававіч, які меў паўтары валокі заселенага людзьмі грунту. Сума арэнды млына складала 8 коп. Наяўнасць працаўнікоў і скаціны ў сям'і дазваляла млынару працаваць на млыне, а іншым дарослым сямейнікам займацца працай па гаспадарцы.

Таксама В. І. Мялешка вылучае катэгорыю беззямельных млынароў, якія не карысталіся «вольнымі» валокамі, не мелі скаціны і, напэўна, зараблялі толькі на млыне. Такія млынары вядомыя ў сёлах Цімошкі, Саматаевічы і Юравічы Крычаўскага староства з інвентара 1747 г. [9, арк. 67, 95, 96], сяле Чыкоўка Прапойскага староства з інвентара 1750 г. [10, арк. 220] і сяле Язёры Язёрскага староства 1765 г. [19, l. 24] («лёзны» млынар Іван). Адсутнасць іншых крыніц даходаў можна патлумачыць адсутнасцю дарослых працоўных людзей у сям'і ў выніку халастога, удавецкага, маласямейнага стану млынароў.

Беззямельныя млынары маглі працаваць на найбольш буйных шматфункцыянальных млынах, якія выкарыстоўвалі энергію вады не толькі для размолу збожжа, але і для іншых механізмаў – фолюшаў, крупадзерак, часам тартакоў і рудняў. У 1750 г. у Прапойскім старостве ў сяле Чыкаўка на самым буйным млыне працаваў беззямельны млынар Васіль. Памер «колавага» складаў 38 злотых, у той час як іншыя плацілі ад 9 да 19 злотых [10, арк. 229].

Такім чынам, у заканадаўстве ВКЛ можна вылучыць наступныя групы суб'ектаў, звязаных з млынарствам: землеўласнікі, арандатары і млынары. Першыя адказвалі за стан вады на сваіх і, у выпадку затаплення, суседніх землях. Другія былі звязаныя з землеўласнікамі маёмаснымі адносінамі як вольныя людзі. Трэція выконвалі непасрэдную працу на млынах, адказвалі за іх тэхнічны стан, аднак былі залежнай катэгорыяй насельніцтва, якія маглі як валодаць, так і не мець зямельных надзелаў. Адсутнасць шырокага распаўсюджання ветраных млыноў да XVIII ст. і іх адносная бяспека для маёмасці землеўласнікаў абумовіла іх адсутнасць у заканадаўстве.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Акты Виленской Археографической комиссии: в 39 т. – ред.: П. Кукольник [и др.]. – Вильна, 1865–1915. – Т. 25 – 1898. – XXII, 614 с.
2. Акты Виленской Археографической комиссии: в 39 т. – ред.: П. Кукольник [и др.]. – Вильна, 1865–1915. – Т. 35 – 1910. – VII, 624 с.
3. Акты, относящиеся к истории Западной России: в 6 т. – Спб., 1846–2012. – Т. 3. – 1848. – VII, 316, 17, 14 с.
4. *Внуковіч, Ю. І.* Вытворчыя пабудовы панскіх сядзіб / Ю. І. Внуковіч // Нарысы гісторыі і культуры Беларусі: у 4 т. – рэдкал.: А. І. Лакотка[і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2013–2016. – Т. 1: Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. / А. І. Лакотка [і інш.]. – 2013. – С. 449–483.
5. Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя: у 3 т. / Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2005–2010. – Т. 3. – 2010. – 696 с.
6. Документы Московского архива Министерства юстиции. – М., 1897. – Т. 1. – 1897. – XXIII, 569 с.
7. *Мелешко, В. И.* Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII–XVIII в.) / В. И. Мелешко – Минск: Наука и техника, 1975. – 246 с.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1824. – Воп. 1. – Спр. 1.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 694. – Воп. 2. – Спр. 3982а.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 694. – Воп. 4. – Спр. 1556.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – КМФ-5. – Спр. 1941.
12. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD). – Archiwum Radziwiłłów. – Dz. XXIII. – Cz. 2. – T. 34. – P. 2.
13. *Bennett, R.* History of Corn Milling: in 4 vol. / R. Bennett, J. Elton. – London-Liverpool, 1905. – Vol. 3. Feudal Laws and Customs. – XII. – 330 p.
14. Biblioteka Książąt Czartoryskich w Krakowie. Zbiór Rękopisów. – Rkp. 9115.
15. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. Rankraščių skyrius (LMAVB RS). – F. 43.– B. 8316.
16. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. Rankraščių skyrius (LMAVB RS). – F. 43. – B. 17637.
17. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. Rankraščių skyrius (LMAVB RS). – F. 43. – B. 17601.
18. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA). – F. 1177. – Ap. 1. – B. 3105.
19. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA). – F. SA. – B. 3802.


**(Дата падачы:20.02.2020 г.)**